# З любоўю да Радзімы

## Выхаванне патрыёта і грамадзяніна сродкамі гістарычнага краязнаўства ва ўмовах аграрна-тэхнічнага каледжа

Спецыфіка выхаваўчай работы ў каледжы вызначана пазнавальнымі інтарэсамі навучэнцаў, для якіх прыярытэтныя тэхнічныя веды, а таксама прадметы прыродазнаўча-матэматычнага цыкла. З улікам таго, што сваю будучыню навучэнцы звязваюць з вытворчасцю, мы значную ўвагу аддаем працоўнаму выхаванню. Але патрыятычнае і грамадзянскае выхаванне — сярод галоўных задач у нашай рабоце. Якасна і паўнавартасна ажыццяўляецца гэты працэс перш за ўсё сродкамі гістарычнага краязнаўства.

**Вадзім КУШНЯРОЎ**




Выхаванне патрыятызму і грамадзянскіх якасцей у навучэнцаў — важная задача, якая вырашаецца выкладчыкамі не толькі на занятках, але і пасля. Патрыятычнае выхаванне мае шэраг кірункаў, але для нас важныя наступныя:

1. Знаёмства з гісторыяй малой радзімы праз вывучэнне помнікаў духоўнай культуры, аб'ектаў археалогіі, этнаграфіі, тапанімікі; мастацкіх твораў землякоў (пісьменнікаў, мастакоў); аналіз тапанімічнага матэрыялу. Вялікая значнасць надаецца арганізацыі даследчай работы пра назвы вуліц у родных для навучэнцаў населеных пунктах. Напрыклад, работа на тэму «Пра што гавораць назвы вуліц пасёлка Мар'іна» стала першай у шэрагу падобных даследаванняў, далей былі распрацаваныя тэмы «Даць вуліцы назву» (пра назвы вуліц у горадзе Мар'іна Горка), «Калі з'явіліся сучасныя назвы вуліц аграгарадка Пухавічы», «Ёсць вуліцы Цэнтральныя...» (назвы вуліц у горадзе Барысаве), «Вуліцы, названыя ў гонар герояў, у Лагойску».

2. Азнаямленне з найбольш яскравымі эпізодамі мінуўшчыны. У сваёй дзейнасці я акрэсліў такія важныя тэмы, як стварэнне і развіццё беларускай дзяржаўнасці, утварэнне сучасных абласцей і раёнаў, падзеі Вялікай Айчыннай вайны ў гісторыі розных рэгіёнаў, з якіх прыязджаюць набываць спецыяльнасць у наш каледж навучэнцы;

3. Знаёмства з біяграфіямі і дзейнасцю знакамітых прадстаўнікоў свайго краю, якія сталі выдатным прыкладам адданага служэння Радзіме. Вылучыць іх даволі лёгка, паколькі акрамя рэспубліканскіх календароў знакавых датаў і падзей, раён мае і свой. Абапіраючыся на яго, штогод мы знаходзім цікавыя постаці для больш глыбокага вывучэння. Гэта і ганаровыя грамадзяне раённых цэнтраў, і знакамітыя ўраджэнцы, і вядомыя выпускнікі. Выклікалі цікавасць вядомыя і малавядомыя факты біяграфій, якія леглі ў аснову віртуальных інтэрв'ю з кампазітарам Ігарам Лучанком, нейрахірургам Арнольдам Смеяновічам, мастаком Барысам Рэпіным. Такая форма арганізацыі дзейнасці заахвочвае навучэнцаў, бо дазваляе максімальна задзейнічаць інфармацыйна-камп'ютарныя тэхналогіі.

Выкарыстанне краязнаўчага матэрыялу на занятках па гісторыі ў каледжы мае свае асаблівасці, паколькі ў нас навучаюцца падлеткі з розных рэгіёнаў краіны. Гэта дазваляе нам павялічыць аб'ём і разнастайнасць краязнаўчых ведаў, прыцягнуць увагу навучэнцаў да больш шырокага кола гістарычнай інфармацыі.

Адукацыйны працэс на аснове гістарычнага краязнаўства я ажыццяўляю праз выкарыстанне краязнаўчага матэрыялу на занятках па гісторыі Беларусі. Напрыклад, пры вывучэнні падзей Вялікай Айчыннай вайны выкарыстоўвалася інфармацыя да 75-годдзя хатынскай трагедыі. Падобнае калісьці адбылося і ў Пухавіцкім раёне (у верасні 1943 года разам з людзьмі была спаленая вёска Беразянка). У выніку з'явілася распрацоўка выхаваўчага мерапрыемства «Сцежкамі спаленых вёсак». Пасля яго правядзення ў навучэнцаў з'явілася шчырае жаданне адшукаць назвы спаленых вёсак свайго рэгіёна на плітах мемарыяльнага комплексу «Хатынь».

У працэсе работы над тэмай «Акупацыйны рэжым» адбылася экскурсія ва ўрочышча Папова горка (Пухавіцкі раён) на месца расстрэлу грамадзян яўрэйскай нацыянальнасці 22 верасня 1941 года. Напярэдадні збіралі неабходны краязнаўчы матэрыял у пісьмовых крыніцах, музейных архівах, апрацоўвалі яго і прадстаўлялі ў выглядзе экскурсійнай лекцыі. Пасля экскурсіі навучэнцы, задзейнічаныя ў пошуку і апрацоўцы матэрыялу, афармлялі фотагазету, складалі матэрыял для размяшчэння на сайце ўстановы адукацыі, сайце народнага музея гісторыі ўстановы адукацыі.

На аснове гістарычнага краязнаўства арганізоўваю пазааўдыторную дзейнасць навучэнцаў: ўзаемазвязаныя выхаваўчыя мерапрыемствы, работу гуртка, праектную і даследчую дзейнасць, экскурсіі. З цікавасцю і натхненнем выхаванцы рэалізавалі праект «Ведаем! Памятаем! Ганарымся!», прысвечаны ўдзельнікам Вялікай Айчыннай вайны — супрацоўнікам установы адукацыі, жыхарам пасёлка Мар'іна, у якім размешчаны каледж. Пасля была праведзеная выхаваўчая гадзіна, прысвечаная жыццю і дзейнасці Героя Савецкага Саюза У. Е. Лабанка, чыё імя носіць установа адукацыі. Рэалізацыя праекта і правядзенне выхаваўчай гадзіны далі навучэнцам штуршок для падрыхтоўкі мерапрыемстваў у гонар тых гістарычных асоб, чые імёны носяць установы, у якіх яны набывалі базавую адукацыю. У нашым раёне гэта Свіслацкая СШ імя А. Р.Чарвякова, Пятрожырская СШ імя А. Е. Гурыновіча, Блужскі ВПК дзіцячы сад—базавая школа імя М. Чэпіка, у суседнім з намі — Уздзенская СШ № 2 імя К. Крапівы.

З мэтай павышэння зацікаўленасці навучэнцаў у сумеснай краязнаўчай дзейнасці арганізоўваю яе на прынцыпах пастаяннасці і навуковасці. Гэты падыход ажыццяўляецца праз дзейнасць гуртка «Мінуўшчына», куды наведваюцца навучэнцы з розных абласцей краіны.

Мая ўласная педагагічная работа ўключае некалькі этапаў:

1. Пошук, вывучэнне і апрацоўка краязнаўчага матэрыялу, падтрымка сувязей з краязнаўчымі музеямі. Маю на ўвазе перш за ўсё народны музей гісторыі каледжа і Пухавіцкі раённы краязнаўчы музей. Шырока практыкую экскурсіі ў Музей народнай славы імя У. Е. Лабанка, які знаходзіцца ва Ушачах Віцебскай вобласці, Дзяржаўны мемарыяльны комплекс «Хатынь». Правядзенне экскурсій, як правіла, прызначаю да юбілейных датаў.

2. Тэматычнае планаванне работы гуртка з улікам сувязі нашай мясцовасці з рэгіёнамі прыехаўшых да нас навучэнцаў. У гэтым годзе ў каледж паступілі навучэнцы з Уздзенскага, Старадарожскага, Нясвіжскага, Мінскага, Стаўбцоўскага, Валожынскага, Любанскага, Асіповіцкага раёнаў. Зыходзячы з гэтага акрэслены тэмы праектаў. Напрыклад, навучэнцы са Стаўбцоўскага раёна рыхтуюць даследаванне пра радзіму Якуба Коласа. Вядома, што ён нарадзіўся на Стаўбцоўшчыне, але малой радзімай лічыў якраз Пухавіччыну, што неадназова падкрэслівалі члены сям'і класіка падчас традыцыйнага ў нашым каледжы мерапрыемства «Каласавіны».

3. Распрацоўка і выкарыстанне метадычных сродкаў для актывізацыі пазнавальнай дзейнасці навучэнцаў. Істотным момантам у навучанні з'яўляецца візуалізацыя, таму да кожнай тэмы распрацаваны прэзентацыі, падабраны і сістэматызаваны відэаматэрыял, што дазваляе навучэнцам правільна аналізаваць інфармацыю, арганізоўваць уласную дзейнасць.

4. Распрацоўка тэматыкі творчых праектаў з улікам кантынгенту наведвальнікаў гуртка,

а таксама для навучэнцаў, якія маюць больш высокую матывацыю пры вывучэнні гісторыі. Работа носіць сістэмны характар. У якасці прыкладу можна прывесці ўжо згаданы праект «Пра што гавораць вуліцы пасёлка Мар'іна»: спачатку гэта было даследаванне на адпаведную тэму, потым — паспяховы ўдзел у конкурсе «Тапаніміка роднага краю», а праз некаторы час — удзел у адкрытым рэспубліканскім праекце віртуальных фотазамалёвак «Мая родная вуліца». На пачатку працаваў з адным навучэнцам, а на апошнім этапе з'явіліся тры работы, размешчаныя на партале adu.by, адзначаныя сертыфікатамі.

Не сакрэт, што ўся дзейнасць выкладчыка, гэтая прафесія ўвогуле патрабуюць асабістай зацікаўленасці вучэбным прадметам і жадання перадаць яе сваім навучэнцам і выхаванцам, а таксама ўласнай працавітасці і творчасці, каб было ад чаго загарэцца і ўсхваляваца падлеткавым душам. Толькі тады не будзе мяжы паміж заняткамі і пазааўдыторнымі мерапрыемствамі і мерапрыемствы не будуць праходзіць фармальна.

Выкарыстанне гістарычнага краязнаўства не простая задача, у тым ліку і ў арганізацыйным плане, паколькі абапіраецца перш за ўсё на даследаванне. Прычым прадугледжвае непасрэдны ўдзел у пошукавай дзейнасці як выкладчыка, так і навучэнцаў. Мая работа пачынаецца з вывучэння пісьмовых, вусных і рэчыўных крыніц краязнаўчага матэрыялу. Важнымі з іх, на мой погляд, з'яўляюцца серыі кніг па археалогіі, этнаграфіі, тапаніміцы, вуснай народнай творчасці, культуры, гісторыі краю. Асабліва запатрабаваныя кнігі майго земляка, беларускага пісьменніка і даследчыка краязнаўчых таямніц, дзейнага міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь Алеся Карлюкевіча. Маю на ўвазе «Зоры след белых гарлачыкаў», «І векавечны толькі край...», «Сцежкамі Ігуменшчыны», «Ігуменскі блакнот», «Старонкі радзімазнаўства», «І марам волю дам».

У працэсе выкарыстання на сваіх занятках і ў пазааўдыторнай дзейнасці краязнаўчага матэрыялу я ўпэўніўся, што нельга скіраваць навучэнцаў да самастойных адкрыццяў фактаў і пошукаў цікавай інфармацыі без назірання і асэнсавання навакольнай рэчаіснасці, суаднясення яе з фактамі гістарычнага мінулага (мясцовай гісторыі).

Пры арганізацыі краязнаўчай работы для актывізацыі пазнавальнай дзейнасці навучэнцаў я выкарыстоўваю розныя варыянты даследчага метаду. Паведамляю пра тыя ці іншыя адкрыцці ў галіне навукі, загадкі гісторыі, а навучэнцы самі будуюць логіку адкрыцця, шукаюць шляхі да яго. Першая загадка, з якой сутыкаюцца госці нашага рэгіёна, — чаму раён з адміністрацыйным цэнтрам горад Мар'іна Горка носіць назву Пухавіцкі? Для навучэнцаў гэта таксама загадка, але я даю толькі кірункі па яе разгадванні. Яны самі знаходзяць адказ, а іншы раз, захапіўшыся таямнічасцю гісторыі, прадстаўляюць уласныя здагадкі.

Як сведчыць мой вопыт, поспех выкарыстання краязнаўчага матэрыялу ў адукацыйных і выхаваўчых мэтах залежыць ад наступных фактараў:

- наколькі глыбока сам выкладчык цікавіцца гісторыяй краю і бярэ непасрэдны ўдзел у яго вывучэнні, прыцягвае навучэнцаў да такой дзейнасці;
- ці створаны для навучэнцаў ўмовы для самастойных даследаванняў, а значыць, і адкрыццяў;
- наколькі эфектыўна выкладчык кіруе дзейнасцю навучэнцаў і ўласным прыкладам стварае і падтрымлівае атмасферу пошуку.

Маніторынг якасці паспяховасці маіх вучняў паказвае, што ў большасці навучэнцаў, якія займаюцца даследаваннем краязнаўчага матэрыялу, наведваюць гурток, аб'яднанне па цікавасцях, больш высокая матывацыя да вывучэння гісторыі. У навучэнцаў з'яўляецца магчымасць выкарыстоўваць атрыманыя веды на практыцы як падчас вучэбных заняткаў па гісторыі, так і па-за імі.

Я ўпэўнены, што фарміраванне патрыёта, грамадзяніна, нацыянальна свядомай асобы магчыма толькі на падмурку з ведаў па гісторыі і культуры свайго народа.